УДК 373

**А. С. Гаўрыльчык**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Навамышскі яслі-сад», в. Новая Мыш Баранавіцкага р-на*

# ФАРМІРАВАННЕ ЗВЯЗНАГА МАЎЛЕННЯ Ў ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ ПРАЗ ВЫКАРЫСТАННЕ МЕТАДУ НАГЛЯДНАГА МАДЭЛІРАВАННЯ

**Уводзіны.** Многае ў жыцці чалавека залежыць ад здольнасці да зносін, а мова — сродак зносін, галоўнае багацце. Размаўляць умеюць амаль усе, але правільна размаўляць — адзінкі. Размаўляючы з іншым чалавекам, мы карыстаемся мовай як сродкам для перадачы сваіх думак, уяўленняў, настрою. Чалавек, які добра валодае мовай, мае каштоўнасць у любым асяроддзі, ён успрымаецца як асоба, адораная талентам зносін. Такія людзі з'яўляюцца прыемнымі суразмоўцамі, лёгка ўступаюць у зносіны з прадстаўнікамі любых сфер дзейнасці. Таму невыпадкова развіццё маўлення лічыцца прыярытэтным у дашкольным выхаванні яшчэ з часоў К. Д. Ушынскага, які лічыў, што толькі пры ўмове правільнага навучання маўленню можна рэалізаваць усе іншыя задачы выхавання і навучання [1].

Перыяд дашкольнага дзяцінства лічыцца фундаментам для далейшага развіцця ўсіх бакоў мовы. Паспяховасць навучання дзяцей, падрыхтоўкі да школы ў многім залежыць ад узроўню авалодання звязным маўленнем, мэтанакіраванае фарміраванне якога мае найважнейшае значэнне ў агульнай сістэме работы з выхаванцамі.

**Асноўная частка.** Навучанне мадэліраванню мэтазгодна пачынаць у дашкольным узросце, таму што менавіта дашкольны ўзрост — гэта перыяд найбольш інтэнсіўнага станаўлення і развіцця асобы. Развіваючыся, дзіця актыўна засвойвае асновы роднай мовы і маўлення. Дзеці ўжываюць словы ў самых разнастайных значэннях, адлюстроўваюць свае думкі не толькі простымі, але і складанымі сказамі: вучацца параўноўваць, абагульняць, разумець значэнне слова. Засваенне значэння маўленчых адзінак, абумоўленае авалоданнем лагічных аперацый абагульнення, параўнання, абстрагавання, дазваляе выкарыстоўваць мадэліраванне не толькі для вырашэння задач развіцця лагічнага мыслення дашкольніка, але і для вырашэння задач развіцця маўлення, менавіта звязнага маўлення [2].

Шматлікія даследы знакамітых педагогаў і псіхолагаў паказваюць, што выкарыстанне мадэліравання як сродка фарміравання разнастайных ведаў і ўменняў аказвае станоўчы ўплыў на інтэлектуальнае развіццё дзяцей. У дашкольнай педагогіцы мадэліраванне выкарыстоўваюць пры азнаямленні выхаванцаў з прыродай, фарміраванні элементарных матэматычных уяўленняў, развіцці звязнага маўлення. Асаблівасць і значэнне мадэліравання заключаецца ў тым, што яно робіць наглядным скрытыя ад непасрэднага ўспрымання якасці, сувязі, адносіны аб'ектаў, якія з'яўляюцца неабходнымі для разумення фактаў, з'яў пры фарміраванні ведаў аб наваколлі. Даступнасць метаду мадэліравання для дашкольнікаў даказана псіхолагамі, яна вызначаецца тым, што ў аснове мадэліравання ляжыць прынцып замяшчэння: рэальны прадмет можа быць замешчаны ў дзейнасці дзяцей другім прадметам, схемай, знакам.

Нагляднае мадэліраванне — гэта ўзнаўленне характэрных якасцей і ўласцівасцей вывучаемага прадмета, стварэнне яго замяшчальніка і работа з ім [3]. У дыдактыцы вылучаюць тры віда мадэлей: 1) прадметная — у выглядзе фізічнай канструкцыі прадмета або прадметаў (пласкасная мадэль фігуры, узнаўляючая яго галоўныя часткі, канструктыўныя асаблівасці, знешні выгляд); 2) прадметна-схематычная — у аб'екце пазнання вылучаны адметныя кампаненты, і сувязі паміж імі абазначаюцца з дапамогай прадметаў-замяшчальнікаў і графічных знакаў; 3) графічная — графікі, схемы.

Каб мадэль як наглядна-практычны сродак пазнання выконвала сваю функцыю, яна павінна адпавядаць наступным патрабаванням: якасна адлюстроўваць асноўныя якасці і ўласцівасці, адносіны, якія з'яўляюцца аб'ектам пазнання, быць простай для ўспрымання і даступнай для стварэння дзеянняў з ёй, мець эстэтычны выгляд, адпавядаць узросту дзяцей.

У псіхолага-педагагічнай літаратуры выдзелены заканамернасці выкарыстання метаду мадэліравання ў дашкольнікаў: пачынаць работу з мадэлямі трэба з мадэліравання прасторавых адносін, а затым пераходзіць да мадэліравання часавых, лагічных і г. д.; з адзіных канкрэтных становішчаў да пабудовы мадэлей, якія маюць абагульнены характар; з мадэлей, якія маюць падабенствы з мадэліруемым аб'ектам, да ўмоўна сімвалічных выяў адносін паміж прадметамі; выконваць на знаёмым дзецям матэрыяле, з апорай на веды, атрыманыя на занятках або ў паўсядзённым жыцці. Навучанне мадэліраванню здзяйсняецца лягчэй, калі пачынаецца з прымянення гатовых мадэлей, а затым ажыццяўляецца пераход да іх пабудовы [4].

Мэтазгодна пачынаць работу з выкарыстання метаду нагляднага мадэліравання з другой малодшай групы (3—4 гады), таму што менавіта ў гэтым узросце пачынае фарміравацца маўленне, актывізуецца і пашыраецца слоўнікавы запас дзіцяці. Этапы знаёмства з мадэллю:

1) прадметнай (наборам прадметных малюнкаў). Такія мадэлі выкарыстоўваюцца ва ўзросце 3—4 гадоў;

© Гаўрыльчык А. С., 2016



Рэпазіторый БарДУ

2) прадметна-схематычнай (схематычнай выявай прадмета): дзяўчынка — круг і трохвугольнік; елка — трохвугольнік; ракета — прамавугольнік і трохвугольнік; рака, туман, дождж — хвалістыя лініі, кропачкі;

3) каляровай: картачка жоўтага колеру — сонца, дзьмухавец; рознакаляровая — певень; шэры авал — мышка, вожык, хмара;

4) схематычнай (схематычнай выявай прадмета). Напрыклад, на адной картачцы размешчаны выявы некалькіх прадметаў, па ёй можна скласці словазлучэнне або сказ: схематычная выява зайца і дрэў — *Заяц жыве ў лесе*; чалавека (круг і трохвугольнік), машыны (прамавугольнік і трапецыя) і дома ( квадрат і трохвугольнік) — *Тата едзе дадому*;

5) мадэллю на развіццё вобразнай і тактыльнай памяці: на картачках наклеены мех, пяро, пластык, драўляныя і жалезныя пласціны. Такія картачкі прымяняюцца пры апісанні цацак, жывёл, вопраткі, можна даваць характарыстыкі героям мастацкіх твораў, загадваць загадкі. Напрыклад, набор картачак: аранжавы мех, схематычная выява леса і пеўня — казка «Кот, певень і ліса»; на картачцы наклеена крупа грэчкі, на вобмацак яна калючая, што можа азначаць вожыка або героя з «калючым характарам» [5].

Знаёмства з мадэллю пачынаецца ад самай простай (прадметнай мадэлі) да самай складанай (схематычнай мадэлі, на развіццё вобразнай і тактыльнай памяці). Спачатку дзіця вучыцца бачыць на мадэлі канкрэтныя вобразы, затым складае словазлучэнні, сказы, потым пераказвае мастацкі твор, завучвае вершы на памяць, складае апавяданне. Найвышэйшае дасягненне — складанне небыліц, казак і самастойнае схематычнае замалёўванне свайго твора [6].

На пачатковым этапе работы з метадам мадэліравання вывучаецца навукова-метадычная літаратура па пытаннях маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту, выбіраюцца асноўныя накірункі работы. На арганізацыйным этапе складаецца план работы, распрацоўваюцца канспекты заняткаў, сістэматызуецца наглядны матэрыял. Заключнай часткай работы з'яўляецца падвядзенне вынікаў, афармленне вопыта работы, прадстаўленне каллегам.

**Заключэнне.** Мэтанакіраванае выкарыстанне метаду нагляднага мадэліравання ў маўленчым развіцці дзяцей актывізуе не толькі пазнавальную дзейнасць, але і спрыяе актыўнаму развіццю іх лагічнага мыслення, умення аперыраваць паняццямі і сімволікай, прадстаўляць умовы і рашэнне пастаўленых задач у розных выглядах: табліцах, схемах, графіках. Выкарыстанне наглядных схем пры пераказе, састаўленні апавядання, творчым расказванні, апісанні падзей, карцін значна аблягчае выхаванцам авалоданне звязнага маўлення. Наяўнасць зрокавага плану робіць выказванні дзяцей паслядоўнымі, звязнымі, эмацыянальна афарбаванымі.

**Спіс цытаваных крыніц**


1. Бородич А. М. Методика развития речи детей. М. : Просвещение, 1981.
2. Лира Т. А., Мельник Е. И. Речевое развитие дошкольников с использованием моделей. Мозырь : Содействие, 2011. 100 с.
3. Там же.
4. Бородич А. М. Методика развития речи детей.
5. Лира Т. А., Мельник Е. И. Речевое развитие дошкольников с использованием моделей.
6. Шашок В. Н. Педагогический опыт воспитателя дошкольного образования: технология формирования : метод. пособие. Минск : Сэр-Вит, 2015. 64 с.



**УДК 371**



**Е. В. Громадская, Т. С. Конопацкая**

*Государственное учреждение образования «Ясли-сад № 3 г. Лунинца», Лунинец*


## РОЛЬ ЗАНЯТИЙ-ТРЕНИНГОВ В ФОРМИРОВАНИИ ОСНОВ ЭКОЛОГИЧЕСКОЙ КУЛЬТУРЫ У ВОСПИТАННИКОВ СТАРШЕГО ДОШКОЛЬНОГО ВОЗРАСТА

**Введение.** Дошкольное детство — начальный этап формирования личности человека, его ценностной ориентации в окружающем мире. В этот период закладывается позитивное отношение к природе, себе и окружающим людям. Поэтому экологическое образование выступает как сложный педагогический процесс. Знание основ экологии — это важнейший компонент экологической культуры, развиваемый у дошкольников.

Актуальность проблемы экологического воспитания, начиная с раннего детства, обусловливает необходимость поиска, разработки и использования в педагогической практике эффективных педагогических средств.


© Громадская Е. В., Конопацкая Т. С., 2016



Репозиторий БарГУ